

## ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ АБ МІХАСЕ ЛЫНЬКОВЕ:

- За добрую вучобу атрымаў кнігу Гогаля «Вечары на хутары ля Дзіканькі».
- Першым беларускім творам, які прачытаў Васіль Быкаў, быў аповед Міхася Лынькова «Гой».
- На Кургане Славы, які ў 1971 г. адкрылі пад Слуцкам, на мемарыяльнай пліце значацца імёны жонкі М. Лынькова Ханы Абрамаўны і сына Марыка, якіх забілі фашысты. А таксама яшчэ імёны сваякоў Міхася Лынькова.
- Лынькоў перапісваў эпапею «Векапомныя дні» да канца свайго жыцця. А пачаў пісаць эпапею аб вайне, партызанскім руху ў 1942 годзе.

## УЗНАГАРОДЫ І ЗВАННІ

- Народны пісьменнік БССР;
- Тры ордэна Леніна;
- Ордэн Кастрычніцкай рэвалюцыі;
- Тры Ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга;
- Ордэн Чырвонай Зоркі;
- Медалі.

## УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ

- У Мінску, Бабруйску, Пінску, вёсцы Малоткавічы Пінскага раёна і вёсцы Лужасна Віцебскага раёна існуе вуліца імя М. Лынькова.
- Імем Лынькова названы цеплавоз ТЭП70-0381 прыпіскі лакаматыўнага дэпо Орша Беларускай чыгункі.
- Пастановай Савета Міністраў БССР Крынкаўскай школе было прысвоена імя М. Ц. Лынькова. У школе створаны музей, які налічвае больш за 600 экспанатаў, у тым ліку каля 300 арыгінальных.
- У 1999 годзе была выпушчана юбілейная манета Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Міхася Лынькова.




**Бібліятэка ім. Д. Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі**



# «Міхась Лынькоў: чалавек-легенда»

**(1899-1975)**

**(125 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі)**

**Горкі 2024**



**Міхаіл Ціханавіч Лынькоў — беларускі савецкі пісьменнік, грамадска-палітычны дзеяч, народны пісьменнік БССР, Член-карэспандэнт і акадэмік АН БССР.**

Нарадзіўся ў в. Зазыбы Віцебскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю ў 1917 г. У 1917-1919 гг. і 1922-1925 гг. працаваў настаўнікам. З 1925 г. – адказны сакратар, рэдактар Бабруйскай акруговай газеты «Камуніст», з 1930 г. – загадчык аддзела Беларускага дзяржаўнага выдавецтва. У 1933-1941 гг. – галоўны рэдактар часопіса «Полымя рэвалюцыі». У 1938-1948 гг. – старшыня Саюза пісьменнікаў БССР. У 1941-1942 гг. – рэдактар франтавой газеты «За Савецкую Беларусь». У 1943-1946 гг. і 1949-1952 гг. – дырэктар Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР, адначасова ў 1946-1953 гг. – загадчык сектара гэтага інстытута.



**М. Лынькоў у рэдакцыі «Савецкай Беларусі». 1942 г.**




Першыя празаічныя творы аўтара з'явіліся ў 1926 г. і насілі аўтабіяграфічны характар – «З пражытых год» і «Гой». Першы зборнік апавяданняў пісьменніка выйшаў у 1927 г. Творчасць Лынькова можна падзяліць на два перыяды. Творчасць першага перыяду прысвечана ў асноўным грамадзянскай вайне і побыту беларускіх вёсак і невялікіх гарадоў. Да гэтага перыяду адносяцца творы «Звычайныя песні», «Над Бугам», «Беня-балагол» і іншыя.



Другі перыяд творчасці Лынькова прысвечаны побыту сялян і чыгуначнікаў. Гэты перыяд пачынаецца з 1930-х гадоў. «Саўка-агіцірнік», «Світка», «Баян», «Салавей-разбойнік», «Пра слаўнага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», «Міколка-паравоз», «Сустрэчы». Падчас вайны пісьменнік пачынае пісаць на ваенную тэматыку: «Васількі», «Ірына», «Дзіцячы чаравічак» і інш. Пасля вайны піша свой самы маштабны твор – раман «Векапомныя дні» ў чатырох кнігах.

У зборніках паэта Валерыя Маракова ёсць цікавы верш «М.Лынькову». Калі яго перачытаць, можна ўбачыць шчырую сімпатыю да сябра, з якім разам былі ў аб'яднанні «Маладняк»:

**«А я гляджу вось на цябе,**
**І мне здаецца ўсё ўпарцей,**
**Што ты жыццё з агнём прабег,**
**Каб сёння стаць на яго варце.**
**Бо ты прайшоў вялікі шлях,**
**І... бачыш, — срэбра голаў кратае.**
**Ты ведаў усё: і сум, і жах —**
**І маладосць твая багатая».**

